Источник: "Belarus" - №7, 2024-07-22





# НЕЗАБЫЎНАЯ ПАМЯЦЬ

**У апараце Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў прайшло пасяджэнне Кансультатытыўнага міжэтнічнага савета. Яго ўдзельнікі абмеркавалі вынікі XIV Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур і пытанні, што датычыліся работы, якую нацыянальна-культурныя аб'яднанні праводзяць для захавання памяці, іх удзелу ў мерапрыемствах, звязаных з 80-годдзем вызвалення Беларусі.**

— Кажуць: "Хто не ведае мінулага, той не мае будучыні". А яшчэ можна дадаць, што для таго, каб помніць, трэба ведаць, ні забываць ні на секунду, перадаваць дзецям, унукам, — звярнуўся да членаў савета намеснік Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Сяргей Герасіменя. Ён агучыў новыя лічбы, якія сталі вядомымі ў выніку расследавання Крымінальнай справы аб генацыдзе насельніцтва Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Так, па інфармацыі Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь пацверджана, што маштаб трагедыі, якая адбывалася на тэрыторыі БССР у гады нямецка-фашысцкай акупацыі, шырэйшы, чым меркавалася раней.

"Генеральная пракуратура вынесла на грамадскае абмеркаванне лічбы, якія






Алена Дзядзюля. Незабыўная памяць

шакіруюць. Раней мы ведалі, што лёс Хатыні падзялілі 186 вёсак, якія былі спалены разам з жыхарамі. Цяпер гэты спіс папоўніўся яшчэ на 102 населеных пункты",— заўважыў Сяргей Герасіменя. І дадаў, што ў рэестры населеных пунктаў, знішчаных часткова, у тым ліку з жыхарамі, ужо 12 348 гарадоў і вёсак. Гэта на 3148 больш, чым было вядома па архіўных дакументах да пачатку крымінальнай справы.

Да адкрыцця мемарыяльнага комплексу ў Трасцянцы, на якое прыязджалі прэзідэнты Германіі і Аўстрыі,




Кнігі, прысвечаныя подзвігам прадстаўнікоў армянскага і азербайджанскага народаў



Уручэнне граматы за актыўны творчы ўдзел у мерапрыемствах XIV Рэспубліканскага фестываля нацыянальных культур і ўнёсак у захаванне міжнацыянальнай згоды ў Рэспубліцы Беларусь грамадскаму аб'яднанню грэкаў "Пелапанэс"

максімальная лічба, якая агучвалася адносна колькасці ахвяр лагеру смерці, які тут размяшчаўся была ў 250 тысяч. Не хапала даследаванняў. Калі ў пасляваенны час Надзвычайная камісія па расследаванні злачынстваў магла вымераць толькі таўшчыню пласта попелу ад спаленых цел, дык сучасныя тэхналогіі дазваляюць устанавіць колькасць ахвяр. Сёння вядома, што на тэрыторыі побач з былой вёскай Малы Трасцянец загінулі 546 тысяч чалавек, сярод іх — і яўрэі з Заходняй Еўропы, якіх сюды прывозілі эшалонамі. Гэта была найбуйнейшая "фабрыка смерці" на тэрыторыі СССР і адна з самых вялікіх у Еўропе.

Наогул на тэрыторыі БССР функцыянавала 560 лагераў смерці (480 да пачатку расследавання), праведзена звыш 180 (140 на момант пачатку крымінальнай справы) буйных карных аперацый. Паводле атрыманых падчас расследавання даных, колькасць ахвяр генацыду — больш за 3 мільёны чалавек (на час узбуджэння крымінальнай справы 2,2 мільёна).

"Усе гэтыя лічбы зводзяцца да яшчэ адной. Сёння мы можам гаварыць, што ў гады Вялікай Айчыннай вайны загінула не чвэрць, а трэць насельніцтва Беларусі. Просьба расказваць пра гэта ў сваіх аб'яднаннях, даносіць да моладзі. Так мы зможам не дапусціць паўтарэння чагосьці падобнага ў будучым",— звярнуўся да членаў савета Сяргей Герасіменя.

Прадстаўнікі нацыянальна-культурных аб'яднанняў штогод не толькі прымаюць удзел у сумесных мерапрыемствах па захаванні памяці аб Вялікай Айчыннай вайне, такіх як наведванне Хатыні, ускладанне кветак да помнікаў на 9 мая і Дзень Незалежнасці, круглыя сталы. Праходзяць патрыятычныя акцыі з моладдзю, вядзецца даследчыцкая работа.

Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр Румак, заўважыў, што тэма памяці стала адной з ключавых падчас XIV Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур, які прайшоў у Гродне. У рамках фестывалю за круглым сталом кіраўнікі нацыянальна-культурных аб'яднанняў расказалі пра тое, які ўнёсак у Вялікую Перамогу зрабілі прадстаўнікі розных народаў. Дарэчы, на беларускай зямлі змагаліся воіны 70 нацыянальнасцяў. Так, 15 армян атрымалі званне Героя Савецкага Саюза за вызваленне Беларусі. Наогул жа ў Вялікую Айчынную вайны на фронт пайшлі каля 600 тысяч армян, дзвесце тысяч з іх загінулі. У выніку сумеснага праекта фонда армяназнаўчых даследаванняў "Анів" і Інстытута гісторыі НАН Беларусі пабачыла свет кніга "Воіны-армяне ў баях за Беларусь (1941–1944)". Даследаванні вяліся ў архівах Расіі, Беларусі, Украіны, Арменіі. Была сабрана інфармацыя пра некалькі тысяч

Источник: "Belarus" - №7, 2024-07-22



армян — вайскоўцаў, партызан, падпольшчыкаў, якія змагаліся з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў Беларусі.

Пазней выйшла кніга, якая расказвае пра ўнёсак азербайджанскага народа ў вызваленне Беларусі. У ёй сабраны матэрыялы пра прыклады гераізму, а таксама прадстаўлены спіс, у якім больш за 1700 імёнаў азербайджанскіх воінаў, якія загінулі на беларускай зямлі. У абароне Брэсцкай крэпасці былі задзейнічаны 44 азербайджанцы.

Падчас XIV Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур таксама працавала мабільная перасоўная экспазіцыя Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны *(на здымку)*, дзе былі прадстаўлены дакументы і фатаграфіі, звязаныя з пачаткам вайны, партызанскім рухам, антыфашысцкай падпольнай барацьбой, а таксама савецкая і трафейная зброя, прадметы, знойдзеныя, на тэрыторыі канцлагера Трасцянец. Тут таксама можна было даведацца пра подзвігі, якія здзяйснялі прадстаўнікі розных народаў на беларускай зямлі. Напрыклад, казах Касан Мамутаў, Герой Савецкага Саюза, кулямётчык 336-га стралковага палка 120 гвардзейскай стралковай дывізіі, 21 лютага 1944 года першым у палку фарсіраваў Днепр. Яшчэ адзін ураджэнец Казахскай ССР, Герой Савецкага Саюза Сёйткасім Ашыраў, камандзір аддзялення разведкі 331 палка 96-й стралковай дывізіі здзейсніў подзвіг у ліпені 1944 у Баранавіцкім раёне. Група разведчыкаў пад яго кіраўніцтвам выйшла ў тыл ворага і нанесла яму вялікія страты.






Праекты, звязаныя з захаваннем памяці былі прадстаўлены на фестывалі ў Гродне на нацыянальных падворках. Так выстаўка пра генацыд ромаў — на падворку цыган, пра Халакост — на падворку яўрэяў, фота матэрыялы “На ратны подзвіг разам ішлі” — украінцаў.

Намеснік старшыні Саюза беларускіх яўрэйскіх грамадскіх аб’яднанняў Алена Кулевіч пад час пасяджэння Кансультатыўнага міжэтнічнага савета расказала, што экспазіцыя, звязаная з Халакостам яўрэяў, якая працуе ў Музеі гісторыі і культуры яўрэяў Беларусі, сёння вельмі запатрабаваная, сюды часта прыходзяць студэнты. Нядаўна была ўстаноўлена памятная дошка на месцы ўвахода ў Мінскае гета, у ліпені прайшло ўрачыстае адкрыццё мемарыяльнага знака, прысвечанага знішчаным у гады вайны яўрэям Жыткавіцкага раёна.

Старшыня Міжнароднага грамадскага аб’яднання “Горо”, пісьменнік, скульптар Хізры Асадулаеў, які прадстаўляе Дагестан, расказаў, што часта яго запрашаюць на сустрэчы ў навучальныя ўстановы, дзе ён расказвае пра патрыятызм і чытае вершы, у якіх гаворыцца пра памяць і любоў да сваёй зямлі. У яго шмат работ, звязаных з Вялікай Айчыннай вайной. Сярод іх — памятныя дошкі маршалу Сямёну Цімашэнку, Герою Савецкага Саюза — азербайджанцу Наджафгулу Рафіеву, помнік сыну малдаўскай зямлі — Іону Солтысу.

Таксама падчас пасяджэння савета Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў уручыў граматы за актыўны творчы ўдзел у мерапрыемствах XIV Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур і ўнёсак у захаванне міжнацыянальнай згоды ў Рэспубліцы Беларусь прадстаўнікам міжнароднага грамадскага аб’яднання “Палесцінская абшчына”, грамадскаму аб’яднанню грэкаў “Пелапанэс” і грамадскаму аб’яднанню “Ромская дыяспара”.

Алена **Дзядзюля**

Фота аўтара



Алена Дзядзюля. Незабыўная памяць